«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Былога ратавальніка МНС асудзілі да чатырох з паловай гадоў калоніі

25.02.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, ціск, свабода мірных сходаў



Рыгор на прысязе з бацькамі. Фота прадастаўлена мамай

**Суд Фрунзенскага раёна асудзіў 26-гадовага Рыгора Давыдава – былога супрацоўніка МНС – да чатырох з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Яго прызналі вінаватым паводле ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэксу.**

Суддзёй у працэсе выступіла **Юлія Блізнюк**. Дзяржаўнае абвінавачанне падтрымала пракурор **Аліна Касьянчык**.

# У чым прызналі вінаватым?

Згодна з фармуліроўкай абвінавачання, ён нібыта здзейсніў не менш трох кідкоў нявызначанымі прадметамі ў бок праезнай часткі і спецыяльнага транспарта дзясятага жніўня непадалёк ад ГЦ “Рыга”. Яго прызналі вінаватым ва ўдзеле ў пагроме, а ўзброены супраціў супрацоўнікам міліцыі, які першапачаткова прысутнічаў у абвінавачанні, выключылі з яго.

Падчас першага пасяджэння былі прагледжаныя відэаматэрыялы справы. На іх асоба, якую немагчыма вызначыць, здзяйсняе, са слоў дзяржабвінаваўцы, “*замахванні нявызначаным прадметам*”. Накірунак і супрацоўнікі, у бок якіх ажыццяўляліся замахванні, таксама не выяўленыя: **у справе няма пацярпелых**.



## Мінск: пачаўся суд над Рыгорам Давыдавым

Вінавацяць у "замахванні", пацярпелых няма

# Што казаў Рыгор?

На судзе Рыгор віну не прызнаў і адмовіўся ад сведчанняў. Падчас апошняга слова ён папрасіў прабачэння ў бацькоў, што за чатыры месяцы ім давялося перажываць за яго, а таксама падзякаваў усім за падтрымку. Ён сказаў, што шмат гадоў аддаў на абарону жыццяў людзей, нават рызыкуючы сваім жыццём. Звярнуў увагу, што ён даў прысягу і ведае, што такое выконваць закон, таму не парушаў яго і не здзяйсняў таго, у чым яго абвінавачваюць.

Суддзя Юлія Блізнюк асудзіла хлопца да **чатырох з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму**. Спагнанне пазова Мінсктранса ў памеры **21 тысячы 831 рубля 69 капеек** і дзяржпошліна ў памеры **1 158 рублёў** вылучанае ў асобную грамадзянскую вытворчасць.

Опубликовать




## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

**Насупраць ГУБАЗіКа, каля Акадэміі навук і гандлёвых цэнтраў. У Мінску з затрымкай вызначылі забароненыя месцы для перадвыбарчых пікетаў**

**Мінчука асудзілі за ўдзел у адной акцыі пратэсту. У якасці доказа выкарысталі яго "аператыўнае апытанне"**

**На цэнтральных плошчах і каля рэдакцый. Дзе на Міншчыне забаронена збіраць подпісы па вылучэнні кандыдатаў**

**Праваабаронцы рыхтуюць дапаможнік пра мірныя сходы для беларусаў і беларусак замежжа**

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Агляд навінаў палітвязняў з 13 па 21 снежня

Агляд навінаў палітвязняў з 5 па 13 снежня

"Чалавек выгаворвае табе ўсе свае страхі". Як аказваюць медыцынскую і псіхалагічную дапамогу асуджаным да смяротнага пакарання

"Пусціўся ў слэм пад "Груз", а ў галаве — ўспаміны пра тыдзень у халодным ШІЗА..." Вялікая размова з экс-следчым, асуджаным па "справе карагодаў"

ГАЛОЎНАЕ

## Выбары*2024. Аналітычная справаздача аб фармаванні тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій дакумент







## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява аб прызнанні 16 чалавек палітычнымі зняволенымі

Магілёўцу Аляксандру Кулікову, затрыманаму па вяртанні з Польшы, дадалі яшчэ паўтара года зняволення

На Віцебшчыне пры вылучэнні зборам подпісаў у раённыя рады кандыдаты маюць няроўныя магчымасці

Стала вядома, хто ўвайшоў у выбарчую камісію ў Краснаполлі

"Нас і не замянілі, проста нікога не ўзялі на нашыя месцы". Працоўны кантракт як метад рэпрэсій

Пыталіся пра стаўленне да Украіны і Ізраіля. Сталі вядомыя акалічнасці затрымання Ірыны Сапрыгінай

"Трэба праверыць, наколькі якасна працуе «Вясна»". Былы назіральнік на выбарах-2020 распавёў пра затрыманне КДБ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Выбары*2024









## ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

## СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY